Источник: **«Звязда» - 2013-03-05**

## Тышкевічы


Яўстафій ТЫШКЕВІЧ.


Васіль ТЫШКЕВІЧ.

**Тышкевічы — знакаміты род Вялікага Княства Літоўскага**

Тышкевічы — старажытны шляхецкі род герба "Ляліва". Пачынальнікам роду з'яўляецца Каленік Мішкавіч, якому вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага Свідрыгайла ў 1437 годзе падараваў сёлы і слабоды ва Украіне — у Жытомірскім і Оўруцкім паветах, а таксама маёнтак Чарталесы, на месцы якога пазней быў пабудаваны горад Бярдзічаў. З цягам часу ў Тышкевічаў з'явіліся маёнткі і на беларускіх землях. Больш за тое, лёс старажытнага беларускага горада Лагойска амаль чатыры стагоддзі быў цесна звязаны з лёсам роду Тышкевічаў.

Род Тышкевічаў быў разгалінаваны. У заснавальніка роду Каленіка Мішкавіча было трое сыноў: Сенька, Івашка і Тышка, якія падзялілі паміж сабой бацькоўскія ўладанні. Утварыліся дзве лініі роду: старэйшая лінія — ад Івана (Скуміна), унука Тышкі (Скуміны-Тышкевічы); малодшая лінія — ад Васіля, сына Тышкі (Тышкевічы-Каляніцкія). Старэйшая лінія згасла ў 1808 годзе, а яе прадстаўнікі засталіся нетытуламанымі магнатамі. У залежнасці ад месцазнаходжання маёнткаў малодшая лінія роду падзялілася на ўкраінскую і беларускую.

Сярод прадстаўнікоў роду было шмат знакамітых асоб: выдатныя палітыкі, таленавітыя военачальнікі, добрыя гаспадарнікі, вядомыя вучоныя, творчыя асобы, шчодрыя мецэнаты. З прадстаўнікоў лініі Скумінаў-Тышкевічаў у гісторыі значны след пакінулі: <I>Іван Львовіч Тышкевіч, які выконваў ганаровую місію вялікага пасла да крымскага хана, з'яўляўся старостам чарнобыльскім і маршалкам гаспадарскім (на пасадзе маршалка гаспадарскага кіраваў прыдворнымі службамі); *Фёдар Іванавіч Тышкевіч,* выконваў гаспадарчыя, фінансавыя, а таксама судовыя і дыпламатычныя даручэнні вялікага князя, займаў пасады ваяводы навагародскага і старосты браслаўскага, адзін з удзельнікаў паходаў караля Стафана Баторыя супраць маскоўскіх войск; *Януш Тышкевіч,* удзельнік вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй, займаў пасады ваяводы мсціслаўскага, трокскага і віленскага; *Людвік Тышкевіч,* кіраваў дваром вялікага князя, прымаў замежных паслоў, вышэйшых ураднікаў дзяржавы, загадваў прыдворнай стражай і каралеўскай гвардыяй, узначальваў пасольства ад сейма ў Санкт-Пецярбургу.




Прозвішчы

- Тышкевіч
- Тышко
- Тышук
- Тышчанка
- Тышчук

Назвы паселішчаў

- в. Тышкавічы

Вядомыя прадстаўнікі лініі Тышкевічаў-Каляніцкіх: *Васіль Тышкевіч,* граф "на Лагойску і Бярдзічаве", заснавальнік рэзідэнцыі ў Лагойску, у гэтым жа горадзе адрадзіў замак, збудаваў храм Богаяўлення, удзельнічаў у бітве з крымскімі татарамі, займаў пасаду ваяводы смаленскага, з'яўляўся старостам (кіраўніком адміністрацыйнай акругі) краснасельскім, чаркаскім, менскім, ваўкавыскім, пінскім, бабруйскім, гайнаўскім; *Юрый Васілевіч Тышкевіч,* кіраўнік мясцовай адміністрацыі (ваявода) на Берасцейшчыне, пасол у Крымскае ханства і Маскву; *Міхал Ян Тышкевіч,* уладальнік Лагойска; *Феліцыян Тышкевіч,* генерал-маёр войска ВКЛ; *Юзаф Ігнацы Тышкевіч,* палкоўнік войска ВКЛ; *Тадэвуш Тышкевіч,* удзельнік вайны Расіі з Рэччу Паспалітай, удзельнік абароны Варшавы, уладальнік Свіслацкага графства ў Ваўкавыскім павеце, сенатар Каралеўства Польскага, старшыня часовага цэнтральнага ўрада Літвы падчас паўстання 1830 — 1831 гадоў.

**Браты Тышкевічы — заснавальнікі беларускай археалогіі**

Найбольшы ўклад у гісторыю Беларусі ўнеслі браты Тышкевічы — Канстанцін Піевіч (1806 — 1868) і Яўстафій Піевіч (1814 — 1873). Канстанцін Піевіч вучыўся ў Полацкім калегіуме, скончыў Віленскі ўніверсітэт, працаваў у Міністэрстве фінансаў Царства Польскага. З 1836 года жыў у горадзе Лагойску, у якім заснаваў ашчадны банк для жыхароў горада і сялян, пабудаваў цукровы завод і палатняную мануфактуру. Канстанцін Тышкевіч стварыў першы ў Беларусі гістарычны музей — Лагойскі музей старажытнасцяў. Ён з'яўляецца таксама адным з заснавальнікаў беларускай

археалогіі: даследаваў шматлікія курганы (да Тышкевіча раскопкі курганоў не праводзіліся), гарадзішчы і замчышчы на тэрыторыі Мінскай губерні, упершыню стварыў тапаграфічныя планы гарадзішчаў. Вывучаў старажытную пісьменнасць яцвягаў. У 1856 годзе пабудаваў флатылію з пяці суднаў, каб праплысці па Віліі. У выніку такога падарожжа сабраў унікальны краязнаўчы матэрыял, які апублікаваў у сваёй кнізе "Вілія і яе берагі". Канстанцін Тышкевіч паклаў пачатак вывучэнню старажытных беларускіх гарадоў Лагойска, Заслаўя, Астрашыцкага Гарадка і інш.

Яўстафій Піевіч скончыў Мінскую гімназію, працаваў у бібліятэках Санкт-Пецярбурга. З'яўляўся членам камісіі па зборы і выданні старажытных актаў, грамат і прывілеяў гарадоў Мінскай губерні XIV — XVI стст. Быў адным з заснавальнікаў і старшынёй Віленскай археалагічнай камісіі. Стварыў Віленскі музей старажытнасцяў, аснову якога склалі ўласныя калекцыі даследчыка: звыш 2000 прадметаў старажытнасцяў (каменныя молаты, паганскія ідалы, старадаўняя зброя), 3000 тамоў рэдкіх кніг, 3000 манет і медалёў, звыш 1000 гравюр, геаграфічных карт, медных гравіраваных дошак. Выкарыстоўваючы вопыт археолагаў Заходняй Еўропы, праводзіў археалагічныя даследаванні гарадзішчаў Друцка, Заслаўя, Крэва, Ліды, Мінска, Міра, Слуцка. З'яўляецца аўтарам кніг, прысвечаных археалогіі шматлікіх беларускіх населеных пунктаў.

На вялікі жаль, багатыя зборы з калекцый братоў Тышкевічаў у розныя гады разышліся за межы сучаснай Беларусі: знаходзяцца ў Маскве, Вільні, Паланзе, Варшаве.

**Паходжанне прозвішча і сучасныя Тышкевічы**

Прозвішчы на *-іч* з'яўляюцца тыповымі для Беларусі. Найбольшая канцэнтрацыя гэтых прозвішчаў адзначаецца ў паўночнай частцы Мінскай вобласці (у раёне Вілейкі і Крывічоў), у наваколлі Бягомля (Докшыцкі раён Віцебскай вобласці) яны складаюць звыш 50% і з'яўляюцца вядучай мадэллю. Высокая ўжывальнасць прозвішчаў на *-ічы* характэрна для Барысаўскага, Браслаўскага, Пружанскага і Лунінецкага раёнаў. І наадварот, у многіх усходніх раёнах Беларусі (асабліва ў памежных з Расійскай Федэрацыяй раёнах) такія прозвішчы амаль не сустракаюцца. Паказальна, што прозвішчы на *-іч* на тэрыторыі Расіі не атрымалі такога распаўсюджвання, як на нашых землях. Імёны на *-іч* у Маскоўскай Русі лічыліся прэстыжнымі: права называцца так рэгламентавалася спецыяльнымі ўказамі. На расійскай тэрыторыі суфікс *-іч* маглі мець у сваіх прозвішчах толькі прадстаўнікі вышэйшых слаёў грамадства — князі і баяры.

Суфікс *-іч* спачатку ўжываўся для абазначэння роднасных сувязяў, а затым для ўказання нашчадкаў па мужчынскай лініі. Пацвярджэннем гэтага служыць і прозвішча Тышкевіч: родавае прозвішча вядзе свой пачатак ад уласнага асабовага імені аднаго з сыноў заснавальніка роду — *Тышкі Каленікавіча*. *Тышка* — народная скарочаная форма ад кананічнага імя *Цімафей*.

Тышкевічы валодалі шматлікі маёнткамі на тэрыторыі Мінскай, Віленскай, Ковенскай і Кіеўскай губерняў. А таму магчыма, што прозвішча *Тышкевіч* насілі не толькі многія прадстаўнікі славутага роду, але і сяляне, якія адносіліся да гэтых маёнткаў. Устаноўлена, што ў цяперашні час прадстаўнікі роду Тышкевічаў жывуць у Польшчы, Францыі Бельгіі і Вялікабрытаніі.

Прозвішча Тышкевіч распаўсюджана па ўсёй Беларусі: яно сустракаецца ў горадзе Мінску, у Бярозаўскім, Ганцавіцкім, Драгічынскім і Маларыцкім раёнах Брэсцкай

вобласці, Аршанскім, Гарадоцкім, Лепельскім і Чашніцкім раёнах Віцебскай вобласці, Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці, Асіповіцкім, Краснапольскім, Круглянскім, Крычаўскім раёнах Магілёўскай вобласці, Барысаўскім, Валожынскім, Вілейскім, Пухавіцкім і Старадарожскім раёнах Мінскай вобласці. У асобных раёнах Беларусі сустракаюцца аднакаранёвыя прозвішчы: *Тышко* (Драгічынскі і Кобрынскі раёны Брэсцкай вобласці), *Тышук* (Брэсцкі раён Брэсцкай вобласці), *Тышчанка* (Навагрудскі, Гродзенскі і Бераставіцкі раёны Гродзенскай вобласці), *Тышчук* (Чашніцкі раён Віцебскай вобласці).

На тэрыторыі нашай краіны засведчана адна геаграфічная назва, у аснове якой — уласнае імя*Тышка*: вёска *Тышкавічы* ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці.

**Ігар КАПЫЛОЎ**